# АПОВЕСЦЬ В. ГІГЕВІЧА “КАРАБЕЛЬ” ЯК АНТЫЎТОПІЯ

***Н. І. Галонская***
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка (Мінск)*
*Навук. кір. – Н. В. Заяц, канд. філал. навук, дацэнт*

**Анатацыя.** Вызначаюцца жанравыя характарыстыкі антыўтопіі ў аповесці В. Гігевеча “Карабель”. Вылучаецца агульнае з класічнымі антыўтопіямі, падкрэсліваецца адметнае.

**Ключавыя словы:** В. Гігевіч; “Карабель”; антыўтопія; жанр.

У сусветнай літаратуры шырока прадстаўлены такі жанр, як антыўтопія. “Антыутопія (англ. dystopia) – напрамак у мастацкай літаратуры і кіно, у вузкім сэнсе – апісанне таталітарнай дзяржавы, у шырокім сэнсе – любога грамадства, у якім узялі верх негатыўныя тэндэнцыі развіцця” [1]. Антыўтопія з’яўляецца поўнай супрацьлегласцю ўтопіі, у якой ствараецца мадэль ідэальнага грамадства. Лепшымі ўзорамі антыўтопіі лічацца творы Я. Замяціна “Мы”, Дж. Оруэла “1984”, О. Хакслі “О дзіўны новы свет” і інш. У беларускай літаратуры гэты жанр таксама прадстаўлены – аповесцямі “Апошняя пастараль” А. Адамовіча, “Карабель” В. Гігевіча, раманам “Мова” В. Марціновіча і інш. Так, у аповесці В. Гігевіча “Карабель” (1989) захаваны вызначальныя характарыстыкі гэтага жанру [2].

1. *У тэксце ёсць тлумачэнні сацыяльнага ўладкавання, норм, правіл існавання пэўнага грамадства.* Да апошніх старонак кнігі “Карабель” некаторыя з іх так і застаюцца незразумелымі і загадкавымі. У розных структурных частках аповесці падаюцца тыя ці іншыя апісанні грамадскага ладу, якія паступова складаюцца ў адно цэлае. Гэтыя правілы і нормы спачатку не напружваюць галоўнага героя Ёха, але паступова становяцца прычынай яго маральных пакут.

2. *Большасць насельнікаў грамадства лічыць яго ідэальным, упэўнена, што інакш жыць нельга.* Бацька героя не шкадуе людзей, пакараных пераводам на першы, самы цяжкі для жыцця, паверх: “Ніякія яны не няшчасныя, проста недысцыплінаваныя. Ім трэба было добра і сумленна працаваць і дачакацца сваёй чаргі на пропуск” [3, с. 220]. Настаўнік, у сваю чаргу, патрабуе не шкадаваць бацькоў пасля таго, як Ёх сам адправіў іх на пакуты на першы паверх. Настаўнік пераконвае вучня ў неабходнасці жыць у імя ілюзорнай будучыні і дзеля яе адмовіцца ад сям’і: “Табе шкада бацькоў, Ёх. Табе шкада кахання, тых простых

уцех, якія задавальняюць людзей ніжэйшых паверхаў... Але чаму ж ты не хочаш пашкадаваць тых, хто застанецца пасля нас? Падарожжа цягнецца стагоддзі. Цэлыя пакаленні ўсё жыццё праводзяць у караблі. Хто дае табе права адбіраць у іх радасць жыцця?” [3, с. 254]. Зразумела, што ў такіх умовах, калі з дзяцінства ўбіваецца ў галаву адна ідэя, кожны будзе лічыць яе ідэальнай, быццам, так і павінна быць. Жыццёвая драма Ёха заключаецца менавіта ў сутыкненні “ідэальнага” грамадства і “неідэальнай” сям’і, дзе насуперак пагрозам захоўвалася спадчына мінулых пакаленняў. Ён сам прымусіў судзіць уласных бацькоў за праўду, якая пераходзіла з пакалення ў пакаленне, і такім чынам пацвердзіў сур’ёзнасць сваіх намераў дайсці да пасады камандзіра.

3. *Замкнёная, абмежаваная прастора. Ізаляцыя падкрэсліваецца фізічнымі межамі, адсутнасцю сувязі з іншымі супольнасцямі*. Карабель – гэта сем паверхаў, тут няма магчымасці перайсці з аднаго на другі самастойна, без пропуску ці дазволу. Толькі лепшыя ідуць вышэй, а астатнія апускаюцца на рабочыя паверхі пасля навучання на трэцім і чацвёртым. Кожны крок кантралюецца, а любое адхіленне ад нормы жорстка караецца. Нават звычайны паход у лес адбываецца праз прапускную сістэму: “…Трапіць на луг ці ў лес можа толькі той, хто не парушае Закон Карабля і добра сябе паводзіць” [3, с. 215].

4. *Усе персанажы ўключаны ў агульнае жыццё (рытуалы, сумесная праца, рыторыка яднання)*. Кожны жыхар з’яўляецца мінімальнай, але важнай часткай механізму, які забяспечвае жыццядзейнасць Карабля. Нават пасля смерці чалавек становіцца каштоўным матэрыялам. “Ведаў я, што звычайна нябожчыкаў апускаюць на першы паверх, і што там з імі робяць – нікому не вядома, акрамя тых людзей, якія адбываюць пакаранне” [3, с. 232].

5. *У антыўтопіі на першы план вылучаецца герой, які адчужаецца ад іншых, што прыводзіць да канфлікту чалавека і сістэмы*. Так, у рамане О. Хакслі “О дзіўны новы свет” большасць амаль не пакутуе ад грамадскага ладу, а толькі Дзікун, якога прымусова завезлі туды, разумее ўсю безвыходнасць становішча. У рамане Р. Брэдбэры “451 градус па Фарэнгейту” герой разам з іншымі пачынае змаганне, мэта якога – данесці да нашчадкаў літаратуру і не даць ёй загінуць. Галоўны герой аповесці В. Гігевіча не выключэнне. “Я ведаю, што гэтым парушаю Закон Карабля, бо камандзіру Карабля забаронена пісаць дзённікі…” [3, с. 213], – паведамляе ён у запісах. З іх чытач даведваецца, што на працягу ўсяго жыцця Ёх ні разу не пераступіў мяжу дазволенага. На працягу аповесці можна заўважыць, што герой адчужаецца ад іншых, але з мэтай больш дасканалага вывучэння прадметаў для будучай кар’еры. Таму, калі ён даведаўся пра Таямніцу Карабля, у яго не засталося нікога: бацькі даўно загінулі на першым паверсе, каханую забілі здані, сяброў ужо даўно не было. Вось і застаўся герой сам-насам са сваім болем і адчаем.

6. *Канфлікт агаляе метады кантролю, і выяўляецца, што грамадства трымаецца на гвалце і падмане*. “З сённяшняга дня ты пачнеш кіраваць лёсам

дурных людзей, продкі якіх некалі жылі на планеце ў нашай самай-самай справядлівай краіне. У нашай самай-самай справядлівай краіне ўсе людзі павінны былі жыць згодна Закону Стандарту. Дзе б яны ні жылі і чым бы яны ні займаліся, яны павінны былі гаварыць на адной мове, яны павінны былі насіць аднолькавае адзенне, мець аднолькавыя звычкі. Усе людзі – абсалютна роўныя! – мы кіраваліся гэтым справядлівым лозунгам і ўрэшце дабіліся гэтага” [3, с. 261]. Аднак гэтая роўнасць толькі дэкларуецца: усіх “інакшых”, тых, хто “імкнуўся захаваць мову сваіх неадукаваных продкаў”, адрозніваўся колерам скуры, вылучаўся ростам або розумам, выселілі на Карабель і адправілі ў Космас. Сам жа падзел Карабля на паверхі з розным узроўнем жыцця сведчыць пра сацыяльную іерархію, існаванне “нізкіх” і “высокіх” груп насельніцтва. Уся злачынная сутнасць сістэмы Карабля раскрываецца толькі ў канцы твора: да камандзіра Ёха ўрываюцца здані, і, відаць, ён памрэ гвалтоўнай смерцю. Яго гібель ніяк не паўплывае на жыццё Карабля. Той факт, што ён фармальна з’яўляецца галоўным на Караблі, таксама аказваецца падманам.

7. *Яднанне людзей штучнае і магчымае толькі ў масе, а чалавечыя прыхільнасці разбураны ці забаронены*. Галоўны герой Ёх яшчэ ў дзяцінстве страчвае сувязь з бацькамі, сам адпраўляе іх на смерць, выдаючы “тайну”. Ён разбурае сваё каханне да Альміны, застаецца адзін. Пазбаўленне ад чалавечых стасункаў дазволіла яму ўзняцца да пасады камандзіра.

Такім чынам, антыўтопія В. Гігевіча адпавядае ўсім жанравым параметрам. Аднак, на наш погляд, яна ўсё ж недастаткова распрацавана ў параўнанні з класічнымі ўзорамі. З аднаго боку, можна сказаць, што канцоўка твора недароблена: няма вырашэння сітуацыі, нейкага перавароту; аповед даволі манатонны і безэмацыйны. Галоўны герой проста распавядае пра падзеі на Караблі, пра свой лёс і пра шлях да пасады камандзіра. Калі звярнуцца да пачатку твора, то можна зразумець, як дзённік апынуўся на зямлі. Знешнія недасказанасць і незавершанасць пакідаюць шмат пытанняў, актывізуюць чытацкае ўяўленне. З другога боку, такім фіналам падкрэсліваецца ўласцівая ўсім антыўтопіям ідэя: у таталітартным грамадстве, “макетам” якога паўстае Карабель, жыццё чалавека нічога не вартае. Нават дасягнуўшы самай высокай пасады, Ёх быў не сапраўдным кіраўніком, а заставаўся шрубкай наладжанай сістэмы. Ён урэшце зразумеў праўду: “Ды апошні год у мяне з’явілася дзіўнае адчуванне – быццам я ўсяго бяздумная цацка ў руках Таемнага Савета” [3, с. 262].

Антыўтопія ўвайшла ў ачыннае слоўнае мастацтва, але, на жаль, не актыўна. Таму аповесць “Карабель” – гэта вялікі крок наперад у плане засваення гэтага жанру і пашырэння тэматычных межаў. Як і сусветна вядомыя антыўтопіі, аповесць В. Гігевіча нясе ў сабе ўніверсальны сэнс.

**Літаратура**

1. Антиутопия [Электронный ресурс] // Академик : словари и энциклопедии на Академике. – Режим доступа: https://dic.academic.ru/dic.nsf/ruwiki/13124. – Дата доступа: 03.03.2022.

2. Антиутопия как жанр: терминология, предпосылки [Электронный ресурс] // Академик : словари и энциклопедии на Академике. – Режим доступа: https://levelvan.ru/pcontent/dystopias-7/genre. – Дата доступа: 03.03.2022.

3. Гігевіч, В. Карабель : аповесці, раман / В. Гігевіч. – Мінск : Маст. літ., 1989. – 462 с.

# ВОБРАЗ НАСТАЎНІКА Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

***К. С. Калабук***

*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка (Мінск)*

*Навук. кір. – М. С. Рак, выкладчык*

**Анатацыя.** На матэрыяле аповесці Янкі Брыля “Сірочы хлеб” даследуецца спецыфіка мастацкага ўвасаблення вобраза настаўніка ў нацыянальнай літаратуры. Вызначаецца тыпалогія вобразаў, якія з’яўляюцца ідэалам і антыідэалам пісьменніка. Даецца ацэнка вобразу.

**Ключавыя словы:** беларуская літаратура XX стагоддзя; мастацкі вобраз; тыпалогія вобразаў; прататып; настаўнік.

На працягу ўсёй гісторыі нацыянальнага мастацтва тэма “Настаўнік – вучань” была ў цэнтры ўвагі многіх пісьменнікаў. Яе пачынальнікам можна лічыць асветніка эпохі Адраджэння Васіля Цяпінскага, які параўноўваў настаўнікаў з “соллю зямлі”. Да мастацкага ўвасаблення вобразаў педагогаў звярталіся шматлікія пісьменнікі, сярод якіх асабліва вылучаюцца постаці Якуба Коласа, Міхася Зарэцкага, Пімена Панчанкі, Уладзіміра Караткевіча, Івана Навуменкі, Алеся Бадака, Яўгена Хвалея і інш.

Настаўнік, вучань, школа – словы, якія непарыўна звязаны паміж сабой. У раманах, аповесцях, апавяданнях школьнай тэматыкі перад намі паўстае багатая галерэя вобразаў настаўнікаў, закранаюцца шматлікія педагагічныя пытанні, ствараецца яскравы малюнак школьнага жыцця. Мы можам сцвярджаць, што вобраз настаўніка з’яўляецца адным з вечных вобразаў сусветнай і айчыннай культуры і літаратуры.

Прачытаўшы многія творы беларускіх пісьменнікаў, варта адзначыць, што вобраз настаўніка не заўсёды з’яўляецца ідэальным, кожны персанаж мае свой адметны характар, свае погляды на жыццё і прафесію, свае адносіны да вучняў, якія выклікаюць супрацьлеглыя ўражанні ў чытачоў.